**Каралёў П. А.**

# ПАЧАТАК ПРАВЯДЗЕННЯ СІСТЭМАТЫЧНАЙ ПАЛІТЫКІ Ў ГАЛІНЕ АХОВЫ ПОМНІКАЎ АРХІТЭКТУРЫ БЕЛАРУСІ (1825–1869 ГГ.).

***Ключавыя словы:*** гісторыка-культурная спадчына, помнік, рамонт, зберажэнне, адметнасць.

Для перыяду канца XVIII – пачатку XIX ст. у дачыненні беларускіх зямель характэрна палітыка азнаямлення з новымі далучанымі тэрыторыямі, паступовае і асцярожнае ўвядзенне рускіх парадкаў і законаў. Аднак наступныя змены ўрадавай палітыкі звязаны з кіраваннем імператара Мікалая I (1825–1855), які ўмацоўвае асновы манархічнага праўлення, у адпаведнасці з тэорыяй афіцыйнай народнасці. Да гэтага часу трэба аднесці і пачатак новага перыяда ў дачыненні гісторыка-культурнай спадчыны. У тагачасных выданнях паведамлялася: «...с восшедствием на престол... Государя Императора настал новый период для русской археологии» [5, с. 3]. Варта адзначыць, што пад археалогіяй на той час разумелася не столькі навука аб археалагічных адкрыццях, колькі ў цэлым вывучэнне помнікаў старажытнасці.

Галоўная ідэя Мікалая I датычна беларускіх земляў, як адзначаў сам імператар, заключалася ў асіміляцыі «местного края с другими местностями империи» [4, с. 306]. На працэс асіміляцыі паўплывала і вызваленчае паўстанне 1830–31 гг. Назвы «Беларусь» і «Літва» былі забаронены для ўжывання (з 1840 г.), беларускія і літоўскія губерні ва ўсіх канцылярыскіх актах сталі прапісвацца выключна па назвах саміх губерней (Віцебскай, Магілёўскай, Віленскай, Гродзенскай і інш.) [12, спр. 1572, арк. 1]. Замест наймення Беларусь або Літва з'яўляецца тэрмін – «Северо-Западный край».

З 1826 г. распараджэннем імператара католікам забаранялася будаваць капліцы там, дзе большасць насельніцтва складалі праваслаўныя [3, с. 54-55]. У гэты час адбываецца націск на каталіцкую і уніяцкую царкву, што служыла яшчэ большаму аб'яднанню навадалучаных тэрыторый з астатнімі мясцовасцямі імперыі. У 1839 г. адбылося аб'яднанне уніяцкай і праваслаўнай цэркваў. Зачыняюцца і перадаюцца праваслаўным многія каталіцкія манастыры. Так, напрыклад, у Полацку «до 1833 года... были католические монастыри: ксендзов бернардинов, францисканов, доминиканов, базильянов... Исключая доминиканского монастыря все католические монастыри в Полоцке закрыты...» [2, с. 105].

Пашырэнне праваслаўя, якое нярэдка адбывалася з дапамогай адміністрацыйнага рэсурсу, уплывала на зберажэнне помнікаў ар-

хітэктуры уніяцкай і каталіцкай канфесій. У 1832 г была вернута ў праваслаўе і пазней перабудавана Дабравешчанская царква ў Віцебску. Але былі выпадкі, калі храмы пакідаліся не занятымі і паступова разбураліся. У 1838 г. у Дзярэчыне касцёл быў пераабсталяваны ў праваслаўны сабор, у выніку былі страчаны яго унікальныя архітэктурныя рысы [15, с. 100 – 103].

Многія дзеянні падчас паўстання 1830–31 гадоў адмоўна паўплывалі на захаванне архітэктурнай спадчыны краю. Некаторыя помнікі па закону ваеннага часу пераабсталёўваліся ўрадам Расійскай імперыі пад шпіталі, турмы і інш. Так, напрыклад, мінскі жаночы манастыр базыльянак выкарыстоўваўся для ўтрымання ваеннапалонных. Ігуменья манастыра Праскоўя Ляўшыцкая не раз звяртала ўвагу вышэйшых улад на псаванне будынкаў. Аднак яе звароты засталіся без увагі. Праўда, у рэшце рэшт ваеннапалонныя з манастыра былі выселены, але ён так і не быў належна адрамантаваны [14, спр. 22813, арк. 1–2].

Каталіцкія манастыры па прычыне некамплектнасці перадаваліся на так званыя «общеполезные заведения» (бальніцы і інш.). Праваслаўная царква па выказванні обер-пракурора П.С. Мяшчэрскага: “Почитая... время сие удобнейшим к исходатайствования для нужд православных церквей и зданий монастырских, ненужных более для католического исповедания” скарыстала гэтую магчымасць для перадачы іх у царкоўнае ведамства [13, спр. 15765 а, арк. 12 аб, 14]. Апроч таго, у красавіку 1839 г. на аснове найвышэй зацверджанага палажэння многія былыя манастырскія і канфіскаваныя будынкі перадаюцца ваеннаму ведамству. Утрыманне гэтых памяшканняў у належным стане было прызначана імператарам «на счёт края» (г. зн. мясцовых улад) [9, спр. 204, арк. 2].

Разам з тым менавіта падчас праўлення Мікалая І па ўсёй Расійскай імперыі пачынаецца працэс выяўлення помнікаў мінулага. З’явіўся ўказ ад 31 снежня 1826 г. «О доставлении сведений об остатках древних зданий в городах и запрещении разрушать оные».

Змест указа ў хуткім часе быў даведзены да ведама грамадзянскіх і ваенных генерал-губернатараў. Вельмі адметнай стала сітуацыя з замкам у Смалянах (цяпер Аршанскі раён). Спачатку копыскі земскі суд, які збіраў звесткі пра помнікі, адзначаў: «...в Копыском повете древних зданий вовсе не находится». Тады з губернскай канцылярыі ў Магілёве паведамілі: «как известно... в Копыском повете близ местечка Смольян... находятся следы древнего здания замка польской королевы Боны». Таму неабходным вызначалася «распорядиться о описании упомянутого достойного уважения замка, доставлении оному плана и фасада в нынешнем его положении с подробным описанием».

Пры гэтым «доставляя на замечание суду неосновательное донесение начальству» [11, спр. 97, арк. 47 аб.]. Калі ў канцы 1827 г. землямер усё ж выехаў на месца і, як паведамлялася, прыбыў «...в местечко Смольяны для снятия состоящего в оном польской королевы... замка, но как оный замок вовсе истреблен и фундаментов уже не видно, затем и не мог…оному малейшей съемки» [11, спр. 97, арк. 60]. Замак жа насамрэч збярогся, але ў 1820-х гадах праз абыякавасць мясцовых чыноўнікаў не быў выяўлены.

На жаль, і надалей вынікаў са збору звестак было няшмат. Гэта пацвердзілі і пазнейшыя ўказы і цыркуляры 1837, 1842 і 1848 г. і г.д. У большасці выпадкаў належнага выяўлення помнікаў так і не адбылося, гэты працэс зацягнуўся на дзесяцігоддзі. Тыповымі адказамі на запыты з'яўляліся наступныя: «...остатков древних замков, крепостей и других зданий древности, а также памятников и монументов в вверенном мне городе... вовсе не находится» [6, спр. 169, арк. 3]. Такія адпіскі паступілі з Суража, Лепеля, Веліжскага павета, Радашковічаў, Дзісны, Лідскага павета і інш. Нярэдка збор звестак належала праводзіць паліцыі. Адметная гісторыя адбылася ў Полацку, калі мясцовая паліцыя засведчыла існаванне ў гэтым старажытным горадзе толькі аднаго помніка, а менавіта «...имеется древний каменный одноэтажный дом, в коем изволил квартировать Государь Петр Великий...» [10, спр. 51901, арк. 1], а іншых каштоўнасцей, згодна дадзеных паліцыі Полацк не меў.

Такія казусы са зборам звестак не былі адзінкавай з'явай. У 1838 г. ашмянскі спраўнік паведамляў, што «вверенном мне уезде нет никаких древних зданий» [7, спр. 12, арк. 12]. Такі адказ не задаволіў мясцовага губернатара, які сам звярнуў увагу, што «...в м. Креве находятся развалины старинного литовского замка». Пры гэтым спраўніку даводзілася: «Поставляя вам на вид такую неосновательность в донесении начальству, я строго подтверждаю исполнить немедленно во всей точности данное Вам по сему делу предписание» [7, спр. 12, арк. 18].

Разам з тым указ 1826 г. пра збор звестак аб помніках і забароне іх разбурэння ўжо сведчыў пра цікавасць да рэшткаў мінулага. Пры нязначных выніках па яго выкананні сустракаліся асобныя грунтоўныя і цікавыя звесткі пра разнастайныя аб'екты, напрыклад, пра замак у Веліжы, Рагачоўскае замчышча і інш. Збор звестак 1837 г. таксама прыносіў пэўныя поспехі. Асобныя справаздачы мелі грунтоўны характар, дасылаліся паведамленні пра цагляныя сцены рэшткаў замкаў (Маладзечна, Пінск і інш.), пра цэрквы і гарадзішчы.

На 20–30-я гады XIX ст. прыпадаюць першыя ў імперыі працы па зберажэнні некаторых адметных помнікаў архітэктуры. У тым жа ўка-

зе 1826 г. адзначалася магчымасць рамонту будынкаў, «не змяняючы іх старажытных планаў і фасадаў». Аднак у дачыненні да помнікаў аформіўся прагматычны падыход. На запыты губернатараў, што рабіць са шматлікімі аб'ектамі, што знаходзяцца ў стане заняпаду, быў атрыманы наступны адказ: «Разрушать их не должно, но и чинить ненужного ненадобно, а поддерживать одни ворота или такие здания, в которых есть нужные помещения» [1, с. 50]. Мусіла быць моцная аргументацыя для правядзення ахоўных мерапрыемстваў. Але тым не менш, працы на помніках архітэктуры пачалі адбывацца. Адныя з галоўных працаў праведзеныя ў гэты час – рамонт Спаса-Еўфрасіннеўскай царквы ў Полацку (1832–1833 гг.), Дабравешчанскай царквы ў Віцебску (1833 г.).

Аднак у большасці сваёй наўмыснае знішчэнне помнікаў заставалася асноўнай праблемай для справы зберажэння адметнасцей. У некаторых выпадках гэты лёс мог напаткаць і тыя цэрквы, якія па збору звестак былі выяўлены як «принадлежащих к древностям». Так сталася з царквой Казьмы і Дзям'яна ў Рагачове, якая заслужыла павагу, як помнік сягаючы сваёй гісторыяй да XV ст. У храме знаходзіліся старажытныя польскія і лацінскія надпісы, партрэты гістарычных асоб. І хоць вызначалася, што «церковь сия достопримечательна... по её древности», помнік быў разабраны з прычыны «ветхага стану» [11, спр. 97, арк. 23].

У 1830-я гг. расійскі ўрад шмат увагі надаваў вайсковай абароне земляў імперыі, гэтай мэце служылі фартыфікацыйныя збудаванні, якія ствараліся і на беларускіх землях. На жаль, пры гэтым часам цярпелі помнікі мінуўшчыны. Яшчэ пры пабудове крэпасці ў Бабруйску (будаўніцтва распачалося ў 1810 г.). замест былога езуіцкага касцёла быў зроблены капітальны артылерыйскі цэйхгауз, а на месцы манастыра ўзвялі артылерыйскі арсенал.

Брэсцкая крэпасць будавалася пазней (пачынаючы з 1830-х). Сітуацыю з Брэст-Літоўскам добра апісаў П. Шпілеўскі, які сам наведаў Брэст у сярэдзіне XIX ст. Пісьменнік адзначаў: «Там, где был бернардинский костёл и монастырь бернардинок, теперь кадетский корпус; где был монастырь августинцев, теперь – комитет крепостных инженеров; где был иезуитский коллегиум, теперь – дом коменданта крепости; где был монастырь базилианский или униатский, теперь – соборная православная церковь во имя святого Симеона Столпника. Кроме того, снесены римско-католический собор, или фара, униатские церкви святого Михаила, святой Троицы; также упразднен монастырь православный и костёлы реформаторов и кальвинов» [17, с. 31]. Разам з тым, будынкі крэпасці вызначаліся даследчыкам, як «величественные и изящные». У

выніку горад практычна цалкам пазбавіўся сваёй даўняй забудовы, былі знішчаны таксама драўляныя культавыя помнікі.

Так жа сама не надавалася ўвага як помнікам тым адметнасцям, што не адпавядалі пануючай палітыцы і ідэалогіі, у выніку чаго прыходзілі ў запусценне і разбураліся выдатныя адметнасці архітэктуры. У сярэдзіне XIX ст. быў вырашаны лёс Мінскай ратушы (своесаблівага сімвала магдэбургскіх вольнасцей горада), якая была разбурана паводле асабістага распараджэння Мікалая I (1851 г.). У справе Мінскай гарадской думы «О сломке ратушного здания» сцвярджалася, што «здание это весьма ветхое, занимая собой часть главной площади, стесняет её и закрывает вид соборной церкви и вниз спускающихся присутственных мест» [8, спр. 418, арк. 1]. У выніку «последовала собственноручная Его Императорского Величества резолюция: "Сломать"». Знішчэнне помніка зацягнулася і было здзейснена ў 1857 г.

У 50-я гг. XIX ст. Аляксандр II (1855–1881) спрабуе змяніць палітычны курс на землях «былой Польшчы». Праводзіцца амністыя ўдзельнікаў паўстання 1830–31 гг., дазваляецца пашырэнне дзейнасці каталіцкага касцёла. Аднак гэтыя захады былі спынены з пачаткам паўстання 1863–64 гг. Зноў разгортваецца працэс закрыцця каталіцкіх храмаў і манастыроў. Па распараджэнні М. М. Мураўёва зачынена каля 30 каталіцкіх манастыроў і вялікая колькасць касцёлаў.

Адзначым, што менавіта ў сувязі з паўстаннем расце цікавасць да беларускага краю, яго гісторыі і помнікаў даўніны, што адзначаў гісторык У.К. Стукаліч (1856–1918): «Благодаря мятежу 1863 года, внимание русского правительства и общества было обращено, наконец, на Белоруссию» [16, с. 13].

У беларускія землі кіруючымі коламі Расійскай імперыі накіроўваюцца экспедыцыі па выяўленні помнікаў старажытнасцей. З гэтага часу (1860-я гг.) вывучэнне беларускіх помнікаў стала сістэматычным. Урадавыя мерапрыемствы мелі на мэце абгрунтаваць рускае паходжанне мясцовых земляў. Разам з тым даследаванне Беларусі дазволіла адкрыць багаты пласт нацыянальных асаблівасцей, помнікаў мастацтва.

Даследчыкам І.І. Сразнеўскім (1812–1880), членам Рускага геаграфічнага таварыства, былі складзены два маршруты па беларускіх гарадах, адзін з якіх уключаў Дрысу, Полацк, Віцебск, Оршу, Мсціслаў, Магілёў, Слуцк, Мінск, а другі Гродна, Беласток, Бранск, Драгічын, Брэст, Кобрын, Камянец. Па першаму маршруту накіраваўся мастак маскоўскай зброевай палаты Д. Струкаў, яго памочнік-малявальшчык С. Пакроўскі, а па другому прафесар акадэміі мастацтваў І.І. Гарнастаеў. Па выніках экспедыцыі Д. Струкаў пакінуў амаль 200 малюн-

каў помнікаў даўніны. І.І. Гарнастаеў наведаў і замаляваў замак у Навагрудку, Барыса-Глебскую царкву ў Гродна, Камянецкую вежу, Лідскі замак, Царкву ў Мураванцы (Мала-Мажэйкаўскую). Адбылося своеасаблівае адкрыццё гэтых малавядомых дагэтуль помнікаў.

Наступны перыяд (1869–1917 гг.) мае вырашальнае значэнне ў справе зберажэння помнікаў архітэктуры. Бо на гэты час прыходзіцца праца па прыняццю агульнадзяржаўнага палажэння па ахове помнікаў.


1. Алексеев, Л. В. Археология и краеведение Беларуси XVI в. – 30-е годы XX в. / Л. В. Алексеев. – Минск : Беларуская навука, 1996. – 206 с.
2. Без-Корнилович, М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии / М. О. Без-Карнилович – СПб : В типографии III Отд. Собст. Е. И. В. Канцелярии, 1855. – 355 с.
3. Брыгадзін, П. І. Гісторыя Беларусі : курс лекцый / П. І. Брыгадзін [і інш.]. – Мінск : РІВШ БДУ, 2002. – Ч. 2. – 655 с.
4. Довнар-Запольский, М. В. История Белоруссии / М. В. Довнар-Запольский. – Минск : Беларусь, 2003. – 680 с.
5. Краткое обозрение древних русских зданий и других отечественных памятников составляемое при министерстве внутренних дел А. Глаголевым. Часть I. Тетрадь I. О русских крепостях. – СПб : в типографии Министерства внутренних дел, 1838. – 52 с.
6. Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў (ЛДГА). – Ф. 382. Воп. 1. Спр. 169.
7. ЛДГА. – Ф. 388. Воп. 1. Спр. 12.
8. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 24. Воп. 1. Спр. 418.
9. НГАБ. – Ф. 299. Воп. 5. Спр. 204.
10. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 51901
11. НГАБ). – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 97.
12. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (РДГА). – Ф. 777. Воп. 1. Спр. 1572.
13. РДГА. – Ф. 797. Воп. 4. Спр. 15765.
14. РДГА. – Ф. 797. Воп. 6. Спр. 22813.
15. Страчаная спадчына / Т. В. Габрусь, А. М. Кулагін, Ю. У. Чантурыя і інш. ; уклад. Т. В. Габрусь. – Мінск : Полымя, 1998. – 351 с.
16. Стукалич, В. К. Белоруссия и Литва. Очерки из истории городов в Белоруссии / В. К. Стукалич. – Витебск : Губернская типография, 1894. – 62 с.
17. Шпилевский, П. М. Путешествие по Полесью и белорусскому краю / П. М. Шпилевский. – Минск : Беларусь, 2004. – 251 с.